Дзмітрый Радзівончык

# РЭАБІЛІТАВАЦЬ ВЕЧАР




*Яцук, Т. М. Мудрасць вечара : вершы / Таццяна Яцук : [укладальнік В. А. Шніп; мастак Д. С. Камейша]. — Мінск : Звязда, 2024. — 125, [1] с.*

Зусім неабавязкова быць сямі пядзяў у ілбе, каб разгледзець, што у назве зборніка Таццяны Яцук «Мудрасць вечара» *(Мінск, ВД «Звязда», 2024)* маюцца пэўныя каштоўнасныя, філасофскія альтэрнатывы. Што за сімволіка схаваная ў пластах іх значэнняў? Па-першае, у назве кнігі можна заўважыць палеміку з вядомай прыказкай «раніца за вечар мудрэйшая». Дык, можа, варта рэабілітаваць вечар? Чаму б і не?

Для творчасці Таццяны Яцук характэрныя эксперыментальнасць, з аднаго боку, з другога — амаль што лубачная прастата, рамантызаваная гуманістычная філасофія народнага жыцця.

Дзе гасцюе душа?
Там, дзе клён напявае пра лета,
Што шчымлівай пяшчотай
Двары спавіло і людзей,
Дзе ў лясах некранутых
Загадкай цвітуць першацветы
І спакой палымнее ад страт і
Трывожных падзей.

*(З верша «Дзе гасцюе душа?»)*

Хтосьці справядліва заўважыць: «А ў чым эксперымент? Усё вельмі проста і звыкла — лета, двары, лясы». І гэта сапраўды так. Але ж сучаснаму мастацтву ўласцівыя аб'ёмнасць, шматмернасць, універсальнасць. Сёння, прапануючы чытачу нешта іншае, прасцейшае, аўтар рызыкуе выглядаць не зусім выйгрышна. І ўсё ж аўтар рашаецца на дыялог, які паэты ладзілі дагэтуль шматкроць, не ідзе па шляху наўмыснага наватарства. Ніякіх рэвалюцый — стратэгічны напрамак у мастацтве беларускай паэтэсы. І ён дасягае мэты! Са свайго паэтычнага матэрыялу Таццяна Яцук будуе мост праз раку фантазій і мар яе лірычнай гераіні. Разам з імі рухаемся па гэтым мосце і мы, чытачы. Напрамак вызначаны. Крок за крокам бліжэй да саміх сябе, сваіх мар і надзей, трывог і смутку. Пад нагамі струменіцца бурны паток — прынцыпы, маральнасць, здаровы сэнс, здаровы лад жыцця, праблемы, пра-

блемы, праблемы... Нарэшце дзень дагарае, як бенгальскі агонь. І вось на авансцэне ўзнікае вечар.

Катэгорыі матэрыі і духу ў паэтычнай свядомасці чалавека суіснуюць па розных схемах. У Таццяны Яцук мы бачым парнасць, бінарнасць. Радасць і сум. Месяц і сонца. Вада і зямля. Пытанні і адказы. Нават на літаратурнай карце рэспублікі Таццяна Мікалаеўна прадстаўляе пары месцаў: Гродзеншчыну і Берасцейшчыну, вёсачку Радагошча на Навагрудчыне і горад Баранавічы. Вясковае жыццё і гарадское. Дзяцінства і сталасць. Раніца і вечар... Або раніца ці вечар?!

Чаму аўтар аддае перавагу вечару? Чаму паводле паэтэсы гармонія свядомасці і быцця на баку другой паловы сутак? Але ж вечар — яшчэ не ноч. Гэта ўсяго толькі прэлюдыя да нейкага пікавага стану чалавечай прыроды.

Паэтычны голас кнігі складаецца з ёмістых сімвалаў, з вобразных дэталяў — як арнамент. Кожная дэталь — асобны эстэтычны і сацыяльна-псіхалагічны код. Часы сутак, часіны года; пачуццёвасць, чуласць, спагада, іншыя катэгорыі — слядамі, пакінутымі на жыццёвых шляхах, дапамагаюць нам спасцігаць сэнсы гэтага мастацтва. Падмурак для мудрасці знойдзены! Прыслухайцеся да асобных радкоў з вершаў: «Мая зямля! Якая прыгажосць!..»; «Шчымлівы шэпт зямлі…»; «Як сэрца за цябе, Зямля, баліць…»; «Лунае над збалелаю зямлёй…»; «Не загіне ад пакут зямля…». Паэтэса ўжывае мастацкі прыём *увасабленне* — надзяленне нежывых прадметаў уласцівасцямі адушаўлёных істот. Так падаецца на першы філалагічны погляд. Але ж зямля для Таццяны Яцук — жывая істота, наша карміцелька, наша калыска. Катэгорыя астранамічная, касмічная. Жывая душа неўміручай, жыватворнай матэрыі.

А вось радкі пра маці. Такія мілыя, чароўныя словы. Яны нібы спускаюць змест жыцця з касмічных вышынь на зямлю, на бульбяныя палі, замілоўваюць і кранаюць:

Мяне вядуць дахаты Млечны Шлях
І покліч продкаў з дарагіх абшараў.
Матулька, жыта спеліцца ў палях
І дожджык жыватворны шэрыць хмары.

*(З верша «Матулі»)*

Увогуле верш «Матулі» — гэта нешта большае, чым нават паэзія. Гэта погляд скрозь прызму дзесяцігоддзяў. Гэта споведзь. Свайму лёсу, свайму жыццёваму космасу, сваёй жыццёвай сцяжыне, траекторыя якой пралягае праз родны край і матуліна сэрца, праз радасці і горыч, праз цяжкую працу, праз трывогі і спадзяванні на лепшае. І, зразумела, праз творчасць. Амаль у кожнага творцы надыходзіць момант, калі паўстае вобраз маці. Ён першасны, сакральны. Ён на парозе вечара.

Немудрагелісты архаічны інтэр'ер, салодкі пах даўніх часоў, цеплыня матуліных рук, яе голас, усмешка, успаміны дзяцінства — сімвалічнаму вечару жыцця не займаць каларыту. Вечар, як мне падаецца, гэта час для ціхай споведзі, пачатак адліку ўнутранага дыялогу для кожнага, хто крочыць поруч з уласным сумленнем, з памяццю. Радкі з верша «Матулі»:

Ты адпусці мне, мамачка, грахі.
Не ведаю, ці многа іх, ці мала.
Хачу, каб клікаў бусел са страхі,
Каб ты мяне на ганачку страчала.

На старонках кнігі Таццяна Мікалаеўна раскрывае вельмі сур'ёзныя тэмы, вядзе рэй пра тое, без чаго нельга ўявіць жыццё чалавека, жыццё сапраўднага беларуса. Жыццё — як найвялік-

шую каштоўнасць. Жыццё для Радзімы, для бліжніх, для кожнага з нас:

Яны жылі для велічных адкрыццяў
І штурмавалі перашкод брады,
А сталася: цаной уласных жыццяў
Уратавалі горад ад бяды.

*(Верш «Палёт». Памяці лётчыкаў Андрэя Нічыпорчыка і Мікіты Куканенкі)*

Жаночае сэрца. Колькі яму выпадае болю, адчаю, трывог, перажыванняў. Каб усё добра было ў дзяцей і бацькоў, каб ладзіліся справы, каб раніцай свяціла сонейка, а ўвечары выходзіў месяц. Мудрасць якраз у гэтым — у цыклічнасці часовага, у пастаянстве і непахіснасці вечнага. У кожнага творцы надыходзіць момант, калі ты наталяешся прыгажосцю. І вось яна — чарговая альтэрнатыва Таццяны Яцук. Прыгажосць — як альтэрнатыва самі здагадайцеся чаму. Я цытую:

Каля вежаў пачэсных —
спрадвечных святынь –
Я прыцішу свой крок і знямею.
Акунуся раптоўна ў гісторыі плынь,
Дзе і праўды, і волі завея.
Слова ў свет паляціць,
каб паходняй лунаць
Над зямлёю і годнай, і чыстай.
Да травінкі травінка —
шуміць сенажаць,
І салоўка пяе галасіста.

*(Верш «Пытанні... Адказы...»)*

Здавалася б, ёсць рэчы, у якіх не павінна быць альтэрнатыў. Але жыццё пабудавана інакш. Задача — убачыць сілу неперlåможнага святла ў надыходзячым змроку і паказаць яе нам, чытачам, — гэта паэтэсе Таццяне Яцук аказалася па сілах.